## Віталь Еўмянькоў

# Хоцімская вайна

*Гістарычная аповесць*

### Колькі слоў ад аўтара

Гэтая невядомая для многіх беларусаў вайна ўвайшла ў гісторыю як «Хоцімская» (або, як пазначана ў некаторых беларускіх энцыклапедыях, «Хацінская»). Адбывалася яна паміж Рэччу Паспалітай Абодвух Народаў і Атаманскай Портай. Доўжылася ўсяго два гады — пачалася з катастрафічнага паражэння польска-ўкраінскага войска ў 1620-м, а завяршылася трыумфам беларуска-польска-ўкраінскага войска ў 1621-м. З верасня па кастрычнік 1621 г. блізка замка Хоцім (цяпер гарадок Хацін у Чарнавіцкай вобласці братняй для нас Украіны) адбываліся крывавыя бітвы. Іх надзвычай яскрава апісаў сведка і ўдзельнік тых падзей — Якуб Сабескі, бацька будучага караля Яна III Сабескага. Апошні, дарэчы, таксама біўся з туркамі і таксама перамог іх пад Хоцімам, толькі ўжо праз 52 гады — у 1673-м.

Чым цікавая для нас — беларусаў XXI ст. — гэтая вайна? Канечне, парадусім тым, што геній нашага земляка, вялікага гетмана літоўскага Яна Караля Хадкевіча, здолеў разбіць магутнае 300-тысячнае войска турэцкага султана Асмана II. «Ну і што? — магчыма, запярэчыць хтосьці. — Разбіў і разбіў. Нам якая справа?» Памыляецеся, шаноўныя... Якраз дзякуючы мужнасці нашых продкаў сёння мы наведваем не мячэці, а касцёлы і цэрквы, святкуем Раство і Вялікдзень. Бо вынікам паражэння ў той вайне была б брутальная ісламізацыя цяперашніх Украіны, Беларусі і вялікай часткі Польшчы. Нашы продкі гэта добра разумелі.

Аднак, як для мяне асабіста, Хоцімская вайна куды больш цікавая дзіўным, містычным падабенствам з падзеямі сучаснымі... Мяркуйце самі: па-першае, пад Хоцімам сутыкнуліся дзве спрадвеку варагуючыя цывілізацыі: еўрапейская дэмакратыя і ўсходняя дыктатура; па-другое, вайна заспела ўсходніх еўрапейцаў у дужа неспрыяльны момант грамадзянскага супрацьборства.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова



**Віталь Еўмянькоў**

нарадзіўся 5 чэрвеня 1977 г. у Магілёве. Скончыў Магілёўскі дзяржаўны ўніверсітэт імя А. А. Куляшова (у якім цяпер выкладае), кандыдат філалагічных навук. Апублікаваў больш за 100 навуковых артыкулаў. Перакладае з польскай мовы. Аўтар манаграфіі, прысвечанай беларускай іпастасі паэта Адама Міцкевіча, і аповесці «Пялёсткі белай ружы». Сябар Саюза беларускіх пісьменнікаў.

Што я маю на ўвазе? Ды, канечне, рэлігійную раздробленасць, варожасць паміж сваякамі, суседзямі, суайчыннікамі… Гэта ж не смех — праваслаўныя русіны не хадзілі нават па той вуліцы, па якой звычайна ходзяць русіны-уніяты; магістрат Вільні прымусіў пратэстантаў хаваць сваіх нябожчыкаў на сметніку… Дадайце да гэтага традыцыйную лаяльнасць праваслаўных да Масквы, católікоў — да Рыма, кальвіністаў ды іншых пратэстантаў — да Швецыі. А з якой нянавісцю, гідлівасцю нават ставіліся ліцвіны да «клятых ляхаў»? Жамойт і літвін, а яшчэ больш — русін і паляк часта не маглі адзін аднаго зразумець, не тое што дамовіцца аб супольнай вайне.

І, нарэшце, па-трэцяе і па-чацвёртае…

Рэч Паспалітая — гэта парламенцкая рэспубліка. Фактычна ёй кіравалі тыя, каго мы сёння называем алігархамі. Толькі ў XVII ст. яны называліся «магнаты». На пачатку вайны дэпутаты надзвычайнага сойму — магнаты-сенатары доўга не маглі паразумецца. Трэба ваяваць, а яны згадваюць старыя крыўды, як цяпер бы сказалі, — выдзіраюць адзін у аднаго партфелі, б'юцца за крэслы.

Аднак захапіць Рэч Паспалітую магутнай Порце не ўдалося. Чаму? Ці не будзе адказ на гэтае пытанне і адказам на пытанне, якое сёння задае сабе кожны ўсходнік-праеўрапеец: «Як не патрапіць у кіпцюры тырана, як захаваць дзяржаўнасць і культурную самабытнасць?» Рэцэпт нашых продкаў: трэба аб'яднацца палякам, літоўцам, беларусам, украінцам. Прычына перамогі пад Хоцімам простая: праваслаўныя, каталікі, пратэстанты, «усходнікі» і «заходнікі» на нейкі час сталі адзіным целам, адзіным духам. Ці варта яшчэ нешта тлумачыць?

І, як у нас на Магілёўшчыне кажуць, «на закусь»… Ніхто, асабліва Заходняя Еўропа, не дапаможа ў вайне з тыранам. Еўрапейцы лічаць грошы, а не сяброў. Гэта, мяркую, галоўны ўрок Хоцімскай вайны… Туркі, відавочна, пагражалі не толькі Рэчы Паспалітай. Пад пагрозай была ўся Еўропа… Нашы продкі прасілі ў еўрапейцаў дапамогі. Аднак замест войска і зброі атрымалі словы глыбокай занепакоенасці. Нічога не нагадвае?!

Яшчэ адна заўвага адносна наступстваў Хоцімскай вайны для грамадзянскай супольнасці тагачаснай Беларусі. Чамусьці ніхто не звяртае ўвагу на адну надзвычай істотную дэталь. Памятаеце, быў у нашай гісторыі такі рэлігійны, літаратурны і палітычны дзеяч Мялецій Сматрыцкі? Лідар праваслаўных Рэчы Паспалітай, заўзяты вораг уніяцтва, аўтар «Трэнаса»… Раптам у 1627 г. ён перайшоў ва ўніяцтва. Што здарылася? Забойства Кунцэвіча? Магчыма… Але, на наш погляд, прычыны «адступніцтва Сматрыцкага» куды больш глыбокія… І звязаны яны не ў апошнюю чаргу з падзеямі 1620–1621 гг. Рэч у тым, што ўдзельнік Хоцімскай вайны віленскі ваявода Януш Тышкевіч (меў уласную харугву ў войску Хадкевіча) напісаў Сматрыцкаму ліст, у якім падрабязна патлумачыў перавагі аб'яднання хрысціян. Не выключаю, што менавіта гэты ліст для Сматрыцкага (чалавека разумнага, па-еўрапейску адукаванага, не фанатыка) зрабіўся вырашальным…

Цяпер колькі слоў адносна 1-й і 2-й частак паэмы, якую я па традыцыі нашай даўняй літаратуры назваў аповесцю. Гістарычна-даведачным матэрыялам для

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

яе зрабіліся два выданні XIX ст. — «Хоцімская вайна» Якуба Сабескага ў перакладзе Уладзіслава Сыракомлі[1] і жыццяпіс Яна Караля Хадкевіча, складзены Адамам Нарушэвічам. Падкрэслю: аповесць «Хоцімская вайна» — не пераказ гістарычных падзей, а, хутчэй, іх асэнсаванне з пункту погляду нашай з вамі трагічнай сучаснасці. На гэтым, як пісалі продкі, «амэн». Чытайце з задавальненнем!

### Пралог

Вайна! Абрыдлі жонка, вёска, ловы... Мёд не п'ецца.
Вайна! Цябе чакаю з дня на дзень і не магу даўмецца:
Чаму маўкліва швед сядзіць? Каго маскаль чакае?
Турчын навошта ў шапку спіць? Чаму вайну не пачынае?

Сармат[2] — не грэчкасей. Каля спадніцы ён марнее!
Смак мірнага жыцця адчуць літвін не ўмее!
Здаўна вядома — горшага няма выпрабавання,
Чым шляхты мірнае у Княстве існаванне.
Пануе мір — дык ворагаў сярод сваіх шукаюць.
Там крыўду даўнюю, заезд, эксцэс які згадаюць.
Злачынстваў столькі, што стамілася рука шатана
Пісаць пра тое, як пан іншага са свету зводзіць пана.

У Быхаве пан Лаўрыновіч, з баяраў путных магілёўскіх,
Пасек харунжага Кавальскага з кампаніі Валадыёўскіх.
Завіша на двубоі выкрасаў агонь з Агінскага Стэфана.
На сойміку пан Ельскі жыццё забраў у Паца Каятана.
У Вільні ж, на Раство, канцэпт другі адбыўся:

---

[1] «Pamiętnik wojny Chocimskiej» Jakóba Sobieskiego — пад такой назвай у 1854 г. (г. Пецярбург) выйшла адна з самых змястоўных кніг, створаных у быццам бы «нямым» XVII ст. Арыгінальны тэкст — на лаціне («Commentariorum Chotinensis belli, libri tres»). Напісаны ён падчашым каронным Якубам Сабескім каля 1620 г. На польскую мову пераклад усіх трох частак зрабіў У. Сыракомля (1851), а «публічным» першаадкрывальнікам рукапісу быў хутчэй за ўсё Адам Нарушэвіч, які запазычыў у Я. Сабескага пэўныя факты, ствараючы жыццяпіс Яна Караля Хадкевіча. Адразу заўважым тое, што запісы падчашага маюць каштоўнасць як гістарычную, так і літаратурную. З аднаго боку, «Pamiętnik» — дзяржаўны дакумент, бо Я. Сабескі выконваў абавязкі соймавага камісара пры войску Я. К. Хадкевіча і мусіў праўдзіва інфармаваць караля і сенатараў аб падзеях вайны з туркамі. З другога боку, Я. Сабескі — чалавек адукаваны, схільны да творчасці — часта падыходзіў да справы нефармальна. Расквечваў афіцыйныя рэляцыі прыгожымі апісаннямі і каментарамі.

[2] Сарматы — міфічныя продкі шляхты Рэчы Паспалітай, нібыта непераможныя воі, нестрыманыя ні ў забавах, ні ў вайсковых справах. Сарматамі лічылі сябе і шляхцічы Княства. Сарматызм у Станіславаўскі перыяд падпаў забойчай крытыцы (Ф. Багамолец, Ф. Карпінскі і інш.), аднак нам асабіста ў гэтай ідэалогіі імпануе шчырая адданасць Айчыне і магутная вера, на якой трымалася духоўнасць нашай беларускай шляхты.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Хадкевіч Ежы з Радзівілам моцна пасварыўся[1].
Прычына: Слуцкая княжна, з Алелькавічаў роду.
Пан Крыштаф Радзівіл[2] шукаў якую-будзь нагоду,
Каб Соф'ю у Хадкевічаў забраць. І разам з ёю —
Пасагам авалодаць, а праз яго — усёй Літвою.
Сын Радзівіла, Януш, ажаніцца мусіў быў з дзяўчынай,
Хадкевічы ж, пыхлівыя, адмовілі без дай прычыны.
Як кажуць, вынеслі гарбуз на срэбранай талерцы.
Раз'ятрылі нахабствам гэтым Радзівілам сэрцы.

Праз нейкі час, здаецца недзе на Грамніцы,
У Вільні, насупраць пана Ежы камяніцы
Спыніліся жаўнеры радзівілаўскага войска —
Харугвы з тры, магчыма болей… З волі Боскай
Пашыхтаваліся, прывалаклі гарматы,
Дасталі шаблі… і «пайшлі у сваты».
Наперадзе — райтары. За райтарамі — гусары.
Услед за імі — шляхта, а за шляхтаю — татары[3].

---

[1] Гэты надзвычай цікавы, з нашага пункту погляду, эпізод адлюстраваны ва «Успамінах» брэсцкага ваяводы Крыштафа Зяновіча (Krzysztof Zienowicz), камісара караля падчас вядомага ўсёй Рэчы Паспалітай канфлікту Радзівілаў з Хадкевічамі (1600). Запісы Зяновіча былі апрацаваныя ў XVIII ст. Адамам Нарушэвічам і часткова прадстаўлены ў біяграфіі Яна Караля Хадкевіча. Сутнасць канфлікту палягае ў наступным… Слуцкая княжна Соф'я Алелькавіч знаходзілася пад апекай жмудскага старасты Ежы Хадкевіча. Віленскі ж ваявода Крыштаф Радзівіл хацеў, каб яго старэйшы сын Януш пабраўся з княжной шлюбам. І справа была не столькі ў каханні, колькі ў тым вялізным пасагу, які апошняя з Алелькавічаў магла прынесці Радзівілам. Відавочна, што і Хадкевічы не надта спяшаліся пазбаўляцца таго «казачнага» багацця. Ваявода неаднаразова звяртаўся да старасты з пісьмовымі просьбамі. На што Хадкевіч звычайна адказваў: «Калі княжна дасягне паўналецця (16 год. – В. Е.) і сама пажадае выйсці за Януша, тады, канешне, я не буду супраць іх шлюбу». Ежы памёр, і апека над Соф'яй перайшла да яго брата – віленскага кашталяна Геранімa. Неўзабаве Радзівіл пачаў дамагацца мястэчка Копысь пад Оршай, якое належала Хадкевічам. Геранім разам з іншымі прадстаўнікамі роду Хадкевічаў паўстаў супраць шлюбу, бо «Януш і Соф'я знаходзіліся хаця і ў далёкім, але сваяцтве». Завяршылася ўсё тым, што Хадкевічы забаранілі Радзівілу бачыцца з княжной. Дайшло да таго, што Крыштаф Радзівіл, будучы гетманам літоўскім, сабраў немалое войска. Не паскупіліся і Хадкевічы, узброіўшы кавалерыстаў 1600 і пяхоты 600 чалавек. Войска Хадкевічаў мелася абараняць адну з камяніцаў у Вільні, а войска Радзівілаў – тую камяніцу штурмаваць. «6 лютага 1600 г. даведаліся віленцы пра Соф'ю гэтак жа, як некалі траянцы даведаліся пра Алену». Рэч Паспалітая апынулася на парозе грамадзянскай вайны. Менавіта ў гэты час з'явіліся каралеўскія парламенцёры – чатыры сенатары, якія павінны былі не дапусціць праліцця крыві. Камісарам пры сенатарах і быў Крыштаф Зяновіч. Нейкім чынам пасы караля супакоілі абодва бакі. «Шлюб паміж князем Янушам і княжной Слуцкай усё ж адбыўся 1 кастрычніка 1600 г. у Брэсце Літоўскім. Сварка спынілася. Засталася, аднак, памяць пра варажнечу ў сэрцах Януша і Яна Караля».

[2] Крыштаф Радзівіл Пярун (1547–1603) – віленскі ваявода і вялікі гетман літоўскі, адзін з лідараў кальвіністаў у Княстве.

[3] Маецца на ўвазе лёгкая кавалерыя.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Калі б не Ян Хадкевіч[1], кроўны пана Ежы,
Хістаўся б жмудскі стараста, як маятнік, на вежы.
Ян Караль шляхту, пяць харугваў рушання, узброіў,
Чым сэрцы Радзівілам хутка супакоіў…

Раней таксама войнаў, пошасцяў было багата.
Ды брат тады не паўставаў на брата.
А зараз ў Полацку забілі месціча ўсяго за тое,
Што па-русінску[2] ён чытаў Евангелле святое.
Католік лае лютэра, а лютэр ганіць грэка[3].
Са свечкаю не знойдзеш чалавека,
Які б на жыда не злаваў. На кальвіністаў
Паўсталі езуіты — спалілі зборы, арганістаў
Павыганялі. Той уцёк, а той, нябога,
П'е каву… За сталом сядзіць у Пана Бога.

З такім спакоем ні вайны, ні пошасці не трэба:
Бязвінную душу не вораг, дык сусед дашле на неба!
Ісусе мілы! Калі маеш да літвіна шкадаванне,
Не мірам, а вайной нам падаруй выпрабаванне…

**Частка 1**

*Украіна. Нешчаслівы пачатак вайны. Звады Каралеўства з Княствам. Еўрапейская «дапамога». Менскі соймік. Хадкевіч.*

О Украіна! Маці ты герояў. І сёння за усе пакуты
Ты вартая імя святой. Сыны твае душой прыкуты
Да вольнасці. Чакаюць справядлівага суда. Дарма.
Бо праўда ў небе толькі, паміж людзей яе няма…

Той год пачаўся, як звычайна — з дробнай валтузні:
Спачатку ў Вільні дэзунітаў[4] на шаблі уніяты ўзялі.
Спалілі «Антырызіс»[5]. Мітрапаліт у Кіеве пракляў

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

---

[1] Ян Караль Хадкевіч — герой Хоцімскай вайны (1560-1621). Ваявода віленскі і вялікі гетман літоўскі.
[2] На старабеларускай, або «рускай» (на пачатку XVII ст. — «простая молва»), якая надзвычай моцна адрозніваласся ад мовы маскоўскай.
[3] У дадзеным выпадку — «праваслаўнага». Тэрміны «грэкі», «схізматыкі», «дэзуніты» сустракаюцца ў соймавых дыярыушах Рэчы Паспалітай XVII ст. і азначаюць праваслаўных цяперашніх Беларусі і Украіны.
[4] Дэзуніты — праваслаўныя, якія катэгарычна адмовіліся далучыцца да ўніятаў.
[5] Маецца на ўвазе наступнае выданне: Antirrhisis abo Apologia przeciw Krzysztofowi Philaletowi, który niedawno wydał książki imieniem starożytney religii greckiey, przeciw książkom o synodzie Brzeskim, napisanym w roku Pańskim 1597. Sirah 13. Wilno: Daniel Łanczycki, 1600.

Ўсіх недаверкаў[1]. Католікам гарэць у пекле загадаў.
За гэтыя дысгусты[2] Жыгімонт[3] даслаў у Кіеў камісараў.
З ім аргументы два — харугвы дзве адборныя гусараў.
Мітрапаліт уцёк. Але... дарогу камісарам неабачна,
Нібы нажом, адрэзаў Канашэвіч-Сагайдачны[4].
Ледзь не завершылася бойкай. Калі б не два вазы,
Што Леў Сапега[5] золатам напхаў і выправіў з Літвы,
Клявалі б тых гусараў ў стэпе ўкраінскім груганы.
Замест адной, што праўда, другой агонь
забушаваў вайны...

Казакі пераселі ў чайкі. Так разышліся, што — псявера —
З Царграда ў Крым патрапіць не магла ніводная галера.
Пісалі у «Авізах»[6]: быццам «царыкаў татарскіх захапілі»,
Абрабавалі гарады, Стамбул замалым не спалілі[7].
У Рэчы Паспалітай быў тым часам мір з султанам.
Пры Жыгімонце І дамову заключылі з Сулейманам.
Пры Жыгімонце Аўгусце сварыліся — была прычына,
Не тое каб істотная: свярбела дужа скура у турчына.
Прыходзіў ён да нас — піў піва, квас...
А потым з усіх ног бег, небарака, за парог!
Стэфан Баторый з туркамі, здаецца, не сварыўся.

---

[1] «Недаверкамі» і католікі, і праваслаўныя Рэчы Паспалітай па нейкай прычыне называлі пратэстантаў.
[2] Дысгусты (старапольскае) – крыўды.
[3] Кароль Рэчы Паспалітай Жыгімонт III Ваза (кароль-манах).
[4] Пётр Канашэвіч-Сагайдачны (1570–1622) – гетман запарожскага рэестравага войска, неадлучны спадарожнік Яна Караля Хадкевіча.
[5] Леў Сапега (1557–1633) – канцлер Вялікага Княства і, акрамя ўсяго іншага, найбагацейшы магнат Еўропы.
[6] З сярэдзіны XVI ст. па тэрыторыі Рэчы Паспалітай распаўсюджваліся ананімныя лісткі, якія выконвалі інфармацыйную і прапагандысцкую функцыі, г.зн. былі правобразам сучасных друкаваных СМІ (газет). Называліся яны – «Nowinki» (вядома каля 60 асобнікаў), «Авізы», «Рэляцыі».
[7] Запарожцы, на думку Якуба Сабескага, заблукалі паміж дзвюма цывілізацыямі – заходняй дэмакратыяй і ўсходняй тыраніяй. Праблема ў тым, што ні да адной з іх яны не могуць «прыбіцца». Цывілізацыйная маргінальнасць казакаў пераўтварае іх у вечных правакатараў войнаў і канфліктаў. Яны – «слаўныя, магутныя рабаўнікі», і гэтым адрозніваюцца, на думку Я. Сабескага, ад шляхетных рыцараў «без заганы і здрады» з абозу Хадкевіча. Працытуем «Хоцімскую вайну» Сабескага: «Занядбаўшы старыя жаўнерскія законы, жылі яны (казакі. – *В. Е.*) з рабункаў, з варварскай сваволі, з самавольстваў і дзікунстваў іх правадыроў. Незлічоныя іх атрады бадзяліся па Русі, Літве, па Кіеўскім і Браслаўскім ваяводствах; ахвярамі іх сваволі былі касцёлы, маёмасць скарбовая і шляхецкая». Горш за ўсё было тое, што казакі нахабна рабавалі Турэччыну, што і зрабілася, на думку Я. Сабескага, прычынаю шматлікіх войнаў з султанамі Атаманскай Порты, у тым ліку і Хоцімскай вайны. Аўтар падае цікавыя звесткі пра выправы запарожцаў у ваколіцы Стамбула. Называе казакаў-гайдамакаў «ворагамі, горшымі за янычараў», бо з «янычарамі часта можна было дамовіцца, а з казацкімі старшынамі звычайна дамаўляцца даводзілася кракаўскаму кату».

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

І без таго меў клопаты — з Масквой зацята біўся.
Пры Жыгімонце III султан пачаў сваволіць,
Валахаў, Русь Чырвоную, Падолле непакоіць.
Меў незлічоную арду, ніхто яму не мог даць рады,
Апроч палякаў. Аднак з палякамі[1] прычын для звады
Султан не меў. І вось… казакі нарабілі гора —
Пачаставалі туркаў часнаком і уцяклі за мора.

Казакам што? Паваявалі — спачываюць…
Нарабаванае ў карчмах жыдоўскіх прапіваюць.
А ў Турцыі — гармідар. Султан шыпіць ад злосці.
Вайна з Каронай і Літвой у планах ягамосці.
Маскоўскі цар ў агонь галлё сухое падкідае:
Вярзе агідную няпраўду. Вайне і турку патурае.
Яшчэ дзяды казалі: дзе музыка — там баль,
Дзе зло пануе — там сядзіць, бы чорт, маскаль.
Спачатку пана Ожгу[2], каралеўскага пасла, забілі.
Царкву балгарскую з папом і прыхаджанамі спалілі.
Сумненняў не было — у госці хутка турак завітае,
Як костку пёс, так ён Падолле наша абгладае.

«Nowinki» першымі разнеслі весткі пра Асмана:
Нібыта вораг у палон узяў Патоцкага Стэфана[3].
З ім разам Вішнявецкі Канстанцін[4] і Самуэль Карэцкі[5]
Патрапілі ганебным чынам у палон турэцкі!
Сядзяць на ланцугу ў Царградзе ды чакаюць
Спаткання з Ібрагім Пашой. На долю наракаюць.
Памёр, паранены, Жалкеўскі[6]. Патрапіў у хамут
Яго сын першы Ян. Не вырваўся з татарскіх пут
Брацлаўскі ваяводзіч Мікалай. Пётр Казаноўскі,

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

---

[1] «Палякі». Гэты тэрмін у кантэксце XVII ст. патрабуе тлумачэння, бо ў паэме ён не выкарыстоўваецца як звыклы зараз этнонім. Паколькі тут не месца навуковай палеміцы, мы ўсяго толькі абмяжуемся канстатацыяй: тэрміны «паляк», «польскі» ў XVII ст. мелі не нацыянальны, а палітычны характар; «паляк» – літаральна грамадзянін Рэчы Паспалітай.
[2] Пётр Ожга, стараста трэмбавельскі – пасол Рэчы Паспалітай у Турцыі.
[3] Вось што пра гэтае здарэнне паведамляе Якуб Сабескі: «патрапіўся ў рукі ворага і зрабіўся цацкай у руках турэцкіх».
[4] Канстанцін Вішнявецкі (1564–1641) – ваявода белзскі і рускі.
[5] Самуэль Карэцкі (?–1622) – нашчадак княжацкага роду герба «Пагоня». Два разы патрапляў у турэцкі палон. Першы – у 1616 г., другі – у 1620 г. у бітве пад Цацорай. Быў задушаны ў Стамбуле.
[6] Станіслаў Жалкеўскі (1547 (ці 1550) – 1620) – канцлер і гетман вялікі каронны. Якуб Сабескі паведамляе пра яго смерць наступнае: «Надышлі дужа нешчаслівыя для нашай Рэчы Паспалітай часы… Нязломны Жалкеўскі, якім ён быў праз усё жыццё, з'язджаўся з татарамі і, атрымаўшы колькі раненняў, над Днястром, недалёка ад Магілёва, загінуў за Айчыну».

Патоцкі Марцін, Балабан[1], Станіслаў Канецпольскі[2]…
Жалезным сном спяць рыцары на беразе Днястра.
З жахлівых нашых паражэнняў пачыналася вайна.

Дарма кароль імкнуўся аднавіць дамовы, згоды,
Якія пан Жалкеўскі падпісаў. Склікаў народы
Султан ужо ў паход. Тым часам у Кароне Польскай
Маліліся адно — да Чанстахоўскай Маткі Боскай.
Ні гетманаў, ні войска. Кароль палюе ў пушчы.
Забіты канцлер. Шляхта п'е. І Бог адзін відушчы,
Дзе Уладзіслаў[3]. Як Яго Міласць ажаніўся,
Дык, быццам цукар, у гарбаце растварыўся…
Сядзіць ля жончынай спадніцы і у вус не дуе,
Пакуль Асман Малдавію і Русь Чырвоную руйнуе.

А што ж Літва? Літвіны раптам анямелі —
Ціхмяна ў пушчах і лясах сваіх сядзелі…
У Рэчы Паспалітай так было заўсёды —
ледзь з'явіцца якая справа,
Сварыцца пачынаюць Вільня і Варшава.
Не могуць абысціся у адносінах без перцу:
Направа цягне галава, налева просіць сэрца.

Навіны пра вайну Літву не дужа засмучалі —
«Дзе Вільня, а дзе Днестр!» У Княстве меркавалі,
Што туркі — гэта справа Польшчы і палякаў.
«Начорта ратаваць літвінам хітрых ляхаў?»
На сойме надзвычайным без прычыны
Літва пярэчыла ўсяму. «Праклятыя літвіны, —
Пісаў каронны крайчы Мікалай Сяняўскі, —
Ні грошай, ні жаўнераў не далі. На ўзор шатанскі
Заблыталі сенат. Цягнулі час ды страйкавалі,
Пра крыўды дапатопныя з палякамі гадалі».

На шчасце, Польшчу еўрапейцы «падтрымалі» —
Пра еднасць каталіцкую, сяброўства разважалі.
Рыгор XV — пантыфік — абяцаў штодня маліцца.
Якуб Англійскі з туркамі, на жаль, не мог сварыцца,
Бо быў дамовамі звязаны. Развёў рукамі
Цэзар — казалі нават, перад польскімі пасламі

---

[1] Аляксандр Балабан – староста вінніцкі.
[2] Станіслаў Канецпольскі – гетман польны каронны «падчас бітвы, скінуты з каня, у акружэнні ворага доўгі час мужна адбіваўся, але ўсё ж патрапіў у рукі спачатку малдаван, а потым і татараў».
[3] Маецца на ўвазе каралевіч Уладзіслаў, будучы кароль Рэчы Паспалітай Уладзіслаў IV Ваза.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Ён плакаў, як бабёр. Такі закон прыроды —
Сяброў на золата мяняюць еўрапейскія народы.

Тым часам не ў Варшаве, а на крэсах вырашалі лёс краіны.
На сойміку у Менску схапіліся з літвінамі[1] русіны[2].
Русь Белую прадставіў Ванька, змей з-пад Магілёва.
Шыпеў зухвала: «Да вайны усё гатова!
Ды перш, чым ваяваць, нам варта ворагам разжыцца.
Хто нас зацугліў? Хто ў царквах забараніў маліцца?
Не! Не Асман нам унію, нібы хамут, накінуў.
Не турак цэрквы у палон аддаў, у паняверку зрынуў!
Спрадвеку рускай верай Княства наша сілкавалась.
Паслабла, счэзла вера — і дзяржава захісталась…
Куды ні плюнеш — лях сядзіць, бы жаба дзьмецца,
За стол спачатку, потым ў жончын ложак пнецца!
Панове-брацця, яшчэ крыху — зусім не будзе мовы,
Сапега ўжо Статут па-польску друкаваць гатовы.
Чым далей — болей. Лях пануе. Мы — ў прыгоне!
Браты, пакуль бязладдзе у сенаце, мітусня ў Кароне,
Ударым! Выб'ем ляхаў з краю. Запануем!
Як колісь з Вітаўтам, дзяржаву адбудуем!»

«Ўсё гэта слушна! — адгукнуўся Трызна. — Гаспадарку
Нам варта мець сваю! Але ж, даруйце, ў нас на карку
Сядзіць маскаль! Не будзе ляхаў — будуць маскавіты!
Ў ардынскім хамуце вам лепш, чым ў Рэчы Паспалітай?!»
«Спакою я прашу, панове! — выгукнуў Мацей Яновіч,
Смаленскі абывацель. Не шляхцюк — паповіч. —
Масквы не варта нам баяцца…
З Масквой, — заўважыў, — можна аб'яднацца!»
Падчас паводкі, ўвесну, кажуць знаўцы,
Жывуць у згодзе і ваўкі, і зайцы…
Няўжо не абысціся з маскалём без звадак
Хоць час кароткі? Каб усталяваць ізноў парадак…
Бо зараз што? Чым быць русінам — лепей утапіцца:

---

[1] На еўрапейскіх картах XVII ст. тэрыторыя ад Мсціслаўскага да Віленскага ваяводства і Падляшша пазначаецца тэрмінам «Lithuanie» / «Літва». Пераносячы гэты еўрапейскі погляд на адміністрацыйна-геаграфічную сітуацыю XVII ст., мы сыходзім з таго, што ўсе жыхары Княства – ад Магілёва да Вільні – з'яўляюцца літвінамі («літвін» у дадзеным выпадку, канешне, палітонім). Такі «знешні» погляд можа азначаць тое, што харонімы «Белая Русь», «Палессе» мелі значэнне толькі для жыхароў Княства, а тэрмін «Літва», хутчэй за ўсё, быў шматзначным. Па-першае, мог быць канфесіёнімам (абазначаў прыналежнасць да каталіцызму), па-другое, быў харонімам (абазначаў пэўны рэгіён Княства), па-трэцяе, быў палітонімам (абазначаў прыналежнасць да грамадзян Вялікага Княства Літоўскага).

[2] Праваслаўныя Вялікага Княства Літоўскага.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Ні ў ваяводстве, ні ў павеце не прабіцца.
А ў маскаля, калі аддана служыш, пэўна маеш:
Зямлю, кавалак лесу, вёску ад цара прыдбаеш.
«Дзе розум?! Вера?! Дзе сумленне? — Юрага запытаўся, —
Як кляты Юда здрадзіў, пеклу запрадаўся,
Так мы жадаем туркам запрадаць Карону?
Дзеля чаго, панове? Дзеля маскоўскага прыгону!»

Той сойм цягнуўся тыдзень. Мог бы два гады…
Банкеталі, біліся, мірыліся, спрачаліся паны.
Мінск пасля сойму быў падобны да руінаў —
Не тое што жыхар, сабака з места згінуў…
Дарма пасол ад караля пан Януш Казаноўскі
Маліў сойм выправіць на Украіну войскі.
Казаў: «Калі не сядзеце, панове, вы на коней, —
Ні Польшчы, ні Літвы не будзе болей!»
Ужо Літва — не супраць. За вайну сяк-так русіны.
Аднак аднекуль выпаўзалі змеямі прычыны,
Каб пастанову не прыняць. «Казны нястача!»,
«Масква каля Смаленска ваўкалакам скача…»,
«Як выбраць гетмана такім анёльскім чынам,
Каб смакаваў ён і русінам, і літвінам?»
Пан Януш нават плакаў, на калені падаў:
«Адмоўцеся, прашу я, ад дурных нарадаў.
Дзяржава гіне. На парозе — туркі! Хоць шатана
Прызначце вы, панове, у якасці гетмана…
Абы ён справу рухаў!» Нарэшце дасягнулі згоды:
Паслоў даслалі да старога пана ваяводы.

Хадкевіч пасля маскоўскага паходу жыў паволі —
Казалі, з хлопамі самоў лавіў, рабіў, як селянін, у полі.
Не быў ні дня ў сенаце, у трыбуналах не з'яўляўся,
У пушчы паляваў, бацькоўскім домам пераймаўся.
Паслоў сустрэў пад Слуцкам. Выслухаў. Перажагнуўся.
Зняў меч з цвіка. Крутнуў над галавой і… усміхнуўся.
«Нарэшце!» — вымавіў. Гасцям прапанаваў вячэру.
Сам сеў за стол. Падумаў. Выцягнуў з «Апостала»[1] паперу.
Штосьці напісаў. Прыклаў пячатку. Аддаў загад пахолку.
Той знік, як не было. А зраніцы, ледзь-ледзь на золку,
Чорт ведае адкуль, прыйшлі пад Слуцк жаўнеры:
Гусарскія харугвы, рушанне, нямецкія аддзелы…
Сем тысяч з нечым меў Хадкевіч пад рукою.

---

[1] Маецца на ўвазе вядомае Скарынава выданне.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Яшчэ каля сямі — трымаў ў засценках пад Улою[1].
Ўсе за Хадкевічам маглі пайсці хоць д'яблу ў зубы,
Абы не мець ад жонкі клопатаў, ад працы згубы.

На Стрэчанне сойм прывітаў і гетман польны — блізкі
Сябра Хадкевіча, падчашы пан Станіслаў Любамірскі.
Праз дзень назвалі камісараў: крайчы Мікалай Сяняўскі,
Мацей з Лясьнёва падкаморы бельскі, граф на Тарнове
Міхал, Якуб Сабескі, Мікола Касакоўскі. Усе — панове
З Каралеўства. Русь, праўда, супраць ляхаў паўставала,
Але замоўкла хутка, бо палёгку у падатках атрымала.

Зацвердзіў сойм выдаткі на вайну без звыклай тузаніны:
Па злотаму плацілі шляхціцы, па сотні — гміны.
Касцёл плаціў малітвамі, бо толькі імі быў багаты.
Салёнымі гуркамі і капустай заплацілі маястаты!
Хадкевіч ацаніў так трапна шчодрасць дэпутатаў,
Што лепей тут нам абысціся без цытатаў...
З патрэбных дзвюх соцень тысяч меней за палову
Сойм на вайну нашкрэбсці быў гатовы.

Тым часам дэпутаты афіцыйна, на паперы
Распавялі пра колькасць, стан і склад жаўнераў.
Вялося ў той паперы пра вугорскую пяхоту ды уланаў,
Нямецкіх ратнікаў, казакаў, з крыламі гусараў...
Усіх — пад сорак тысяч. Яшчэ казакаў — дваццаць.
Хадкевіч, праўда, усяго ледзь налічыў шаснаццаць.
Апроч літвінаў — ні палякаў, ні казакаў...
Вугорцаў дзве харугвы ды татараў кот наплакаў.
Мялешка з той нагоды мацюкнуўся: «Халера, матка!»
Паноў сенатараў і дэпутатаў варта для парадку —
На Днестр. Там у прысутнасці турэцкага султана
Не да бязглуздых ягамосцям будзе планаў!

На тым яшчэ не амэн... Па старым звычаі
Паслы на мінскім сойме з тыдзень балявалі.
Пасля дэбатаў і нарадаў шукалі ісціну ў віне.
Знайшлі — і распаўзліся, быццам змеі, па Літве.

Вайна тым часам грукала ўжо ў дзверы!
Патрэбны ёй былі не словы, а жаўнеры...

---

[1] Ула – горад у Полацкім ваяводстве, знакамітая ў перыяд Інфлянцкай вайны (1558-1582) цвердзь.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

## Частка 2

*Абоз каля Львова. Еўропа — хімера. «Крым наш». Знакі. Мост праз Днестр. Рокаш. Пераправа. Абоз пад Хоцімам. Канашэвіч-Сагайдачны. З'яўленне войска каралевіча Уладзіслава. Героям слава!*

Якраз на Юр'я Ян Хадкевіч рушыў у бок Львова.
Павёў крыху жамойтаў і амаль усіх русінаў.
Літву на ўсходзе вартаваць кардон пакінуў.
Рашэнне мудрае, бо з туркамі змагаюцца русіны,
Пакуль жанчын іх і майно ахоўваюць літвіны.
Літва ж — не каінава племя: калі маскаль прыбудзе,
Не з соллю хлеб — сталёвы меч здабудзе.

На Тройцу пан Хадкевіч стаў абозам блізка Львова,
Агледзеў войска — з немцаў ледзь дайшла палова.
З-пад харугваў паўцякала шляхта. Забылася на Пана
Запэцкала імя і род, зняславіла прыкметы стана.
Не ходзіць адно ліха. Адгукнулася Варшава:
Даслала пехацінцаў пад харугвай Уладзіслава,
Таксама каралеўскі полк гусараў. На гэтым амэн...

...Было ад веку так: дзяржаваю кіруюць ідыёты,
А за дзяржаву паміраюць патрыёты!
Прывёў уланаў князь Ежы Чартарыйскі.
Харугву конную дадаў Ляшчыньскі — ваявода бельскі.
Аддзел пяхоты, разам з лёгкай конніцай, — Якуб Сабескі.
Па жмені конніцы усыпалі Малінскі і Шашковіч,
Рачынскі Ціхамір даў сотню вершнікаў. Глябовіч
Прыйшоў ў абоз з сынамі. Былі яшчэ героі:
Князь Дамінік Заслаўскі на Астрогу, Агінскі,
Сапега, Радзівілы, Каяловіч, Пацы, Касакоўскі...
Усіх налічыў Хадкевіч, запомніць гэта просім!
Не сто, не дзвесце тысяч — толькі дваццаць восем.

«Дробнай жменяю ішлі мы на вайну! — пісаў Сабескі,
Ішлі не дзеля славы, гонару або фундушаў каралеўскіх.
Змагаліся мы за Еўропу — тую самую прывідную хімеру,
Якую самі збудавалі з любасці, свабоды, веры...
Агульную Еўропу як узнёслы замак хрысціянства,
Якога не было й не будзе ў тых заходніх панствах».

Пакуль збіраліся жаўнеры, Бог нам сыпаў знакі:
У дзень, калі на сойме біліся з літвінамі палякі,
Якраз апоўдні з неба раптам знікла сонца.
Хвіліну не было, аднак здавалася — бясконца...

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Праз тыдзень на Падоллі — землятрус. А ўночы
З хвастом камету ў небе заўважалі вочы.
Што гэта значыць? Езуіты нават не давалі рады.
Чаго чакаць — вайны канца ці, можа, здрады?
Бо сонца знікла — потым зноў на месца стала,
Камета з захаду ляцела, на усходзе ж — дагарала…

Ды, праўду кажучы, Хадкевіч знакамі не пераймаўся.
Каметы бачыў і раней, зацьменняў не баяўся!
Быў чалавекам ён надзвычай рэдкім — рэнесансным:
У Бога верыў шчыра, ды кіраваўся розумам уласным.
Таму на Унебаўзяцце Панны не маліўся, але зранку
Загон турэцкі высек. Даў татарам прачуханку.
Узяў пашу ў палон, а у яго знайшоў пасланне.
Султан пісаў… аб вырашэнні «крымскага пытання».
Маўляў, турэцкім Крым спрадвеку быў і будзе.
Калі не ласкай, дык вайной паўвостраў ён здабудзе.
Аднак не толькі ў Крыме справа. Патурчэнцаў
Багата на Ўкраіне і ў Малдавіі. З іх варта апалчэнцаў
Набраць, узброіць і сустрэць вайной султана.
Прыдумаць лепей — ці хапіла б глузду у шатана?

Канешне, здрада выспявае толькі ў тым выпадку,
Калі няма ў дзяржаве міру, згоды і парадку…
Яшчэ ёсць тыя, што за свабоду прападаюць,
А ёсць, што з радасцю тырана абдымаюць.
Калі раб пажадае ўздзець хамут глыбей на плечы,
Ці мае замінаць яму наш розум чалавечы?
Так разважаў Хадкевіч, збіраў харугвы пад Рэпніцай.
Чакаў падтрымкі ад казакаў. Ліставаўся са сталіцай.

Кароль загадваў не марудзіць — ісці насустрач турку.
«Маўляў, жаўнеры аб'ядаюць шляхту. Паратунку
Падолле просіць у сенаце». Была яшчэ адна прычына
Не на Падоллі, а ў Малдавіі чакаць турчына.
Казакі добра пагулялі, пачалі ўжо пахмяляцца…
Майдан прымусіў іх за розум і за шаблі ўзяцца.
Народ пастанавіў збіраць у Запарожжы войска.
«Ідуць нам туркі помсціць!» — праляцела пагалоска.
Аднак бяда і гора, як вядома, між сабой сябруюць.
Пачулі ўкраінцы: «Разам туркі і паны палююць!»
Маўляў, даўно ўжо спеліся кароль з султанам,
«Змагацца давядзецца з Жыгімонтам і з Асманам».
На шчасце, каралеўскія паслы майдан утаймавалі,
У войска да Хадкевіча ісці казакам падказалі…

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Майдан пагаласіў, палаяўся, параіўся, пабіўся.
Нарэшце ваяваць з турэцкім войскам пагадзіўся.
З адной, аднак, умовай: каб не патрапіць у нерат,
З якога Украіне, як той казаў, ні ўзад ні ўперад,
Казакі ваяваць у адных шыхтах згадзіліся з панамі,
Калі паны і туркі між сабой ударацца ілбамі.

Хадкевіч з-пад Рэпніцы рушыў ў бок мястэчка Брага,
Наперадзе ішлі Сяняўскі, з ім — аршанскі стараста Сапега.
Пасля — харугвы Баратынскага, Ліпніцкага, Зяновіч,
Жаравінскі, Апалінскі, Касакоўскі, Мялешка, Левановіч…
Спыніўся гетман на беразе Днястра. Русіны з Магілёва
Праз Днестр драўляны мост пабудавалі адмыслова[1].
Да іх ніхто не мог той рэчцы даць так хутка рады.
Ледзь за сякеру ўзяўшыся — тапіліся майстры, прылады.
А магілёўцам мост той «цьфу» — зрабіць, раз плюнуць:
Патыліцу пачухаць, сякераю махнуць, ў жалейку дунуць…
Бо маюць досвед — штогод вясной, падчас паводкі,
Ўсё Падміколле, перасеўшы з ганкаў ў лодкі,
Будуе мосцікі, масты, масточкі паміж аборамі, дамамі.
Каб выжыць неяк — бабы нават робяцца майстрамі…

Пакуль рабіўся мост, магутны рокаш узнялі жаўнеры —
Прасілі іх старшыны у імя Айчыны, веры…
Галас суцішыць. Аднак зухваламу што тыя просьбы?
Там чуўся лямант, благанне, тут — мацюкі і грозьбы.
На пляцы выступіў Мялешка: «Браты мае, панове!
Як ясны дзень — жыды з палкоўнікамі ў змове…
І свой, і чужаземец, і ветэран, і навабранец…
Пад'есці раз у дзень павінен мець хоць дробны шанец.
Аднак як шляхціц, так пахолак, як пешы, так і конны —
Ні п'яны, ні цвярозы, ні сыты, ні галодны…»
«Не бачым мяса, давімся мы грэчкай», — загаласіў Саковіч, —
«Замест віна — п'ем, быццам коні, з рэчкі, — дадаў Зяновіч. —
У абозе ж, кажуць, — і каўбасы з кмінам, і мяды з гарэлкай…»
«Ёсць нават ракі з селядцамі!» — выбухнуў Скабелка.
Дайшоў галас да гетмана. Той выйшаў да жаўнераў,
Вус падкруціў, памацаў шаблю, выгукнуў: «Халера!
Якога д'ябла нас сюды прынесла? Смакаваць далікатэсы?

---

[1] Вось што на гэты конт паведамляе Я. Сабескі: «Немагчымым уяўлялася жаданне перарэзаць магутны, хуткаплынны і скалісты Днестр мастом. Спробы, якія рабіліся да таго часу ў шмат якіх месцах, станоўчага выніку не мелі. Жаўнеры пачалі ўжо будаваць мост рухомы, але плынь яго разбурыла. Тады за справу ўзяўся пэўны русін (па іншых звестках – літвін), які праявіў непаспалітыя розум і майстэрства».

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Гарэлку піць? А мо змагацца за дзяржавы інтарэсы?
У Рэчы Паспалітай так было заўсёды — падчас паходу
Ад лёкая да гетмана — жывуць усе без піва і без мёду.
Пра тое, што памёр ад гэтага хоць хтосьці, я навін не маю.
А што да грэчкі... Ем яе усё жыццё — і вам таго жадаю».
Пасля тых слоў Хадкевіч знік. Жаўнеры разышліся.
Да пераправы рыхтавацца пачалі. За розум быццам узяліся.

Вось пераправа пачалася... Любамірскі першым рушыў,
За ім — Ліпніцкі. Ён меў больш сотні шляхты. Далей мусіў
Пан Рыхтар — той вёў паўсотню аркебузнікаў інфлянцкіх.
Ліпніцкі ўзяўся за рабункі — пасля яго заездаў гайдамацкіх
Не заставалася ні вёсак, ні людзей. Магнаты пакідалі замкі.
Уцякалі, не прыхапіўшы ад маёнткаў нават клямкі.
За Рыхтарам пад бел-чырвона-белымі сцягамі ішлі ліцвіны.
Добрыя жаўнеры — ветэраны многіх закалотаў. За Літвою —
Уланы. Здавалася — плывуць яны, нібы анёлы над вадою.
Далей Хадкевіч ехаў. Духам моцны, але дужа хворы, —
Нагадваў ён саву: як свечкі — вочы, нос-джала. Ва ўборы
Гетманскім. За ім — язда[1] Чартарыйскага. Пасля — татары.
Гарматы — далей. Потым — вугорцы, крылатыя гусары.
Усе — з сапегавых харугваў. Далей цягнуліся: пяхота,
Абоз, жыды і бабы, пахолкі, лёкаі і ўсялякая мярзота...

Дванаццаць дзён перапраўляліся праз рэчку войскі —
Ніхто не патапіўся, не уцёк. «Вялікі промысл Боскі»
Хадкевіч ў гэтым заўважаў, хоць засмучаўся,
Бо сам-насам з турчынам у Малдавіі застаўся.
Казакаў, што мусілі чакаць ў абозе над Днястром,
У светлы дзень шукаць дарма было з агнём...
Затое прывіталі гетмана бандыты, гайдамакі.
Каліськці — украінцы, запарожскія казакі,
Шатану душы прадалі, жылі з забойстваў.
Спачатку на Падоллі шчыравалі, потым іх «паспольства»
З'явілася ў Малдавіі. Горш за хваробы, войны
Былі «геройствы» той бандыцкай плоймы.
Так часта сярод дзяцей цнатлівых, паслухмяных,
Выродныя ёсць дзеці. Чарцянятамі празваных,
Дзяцей тых кат праз колькі год вітае. Ну, а па згоне
Вітае ўжо Люцыпар, шатан схіляецца ў паклоне.

Свет бачыў іншых украінцаў. З іх ці не самы значны —
Сябра гетмана — Пётр Канашэвіч-Сагайдачны.

---

[1] З польскай мовы – кавалерыя.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Казакі верылі ў яго, нібы ў Тройцу. Быў ён шчаслівы
І ў полі, і на моры. Баяліся ж яго татары асабліва,
Пачуўшы слова «Канашэвіч», што было, кідалі:
Палонных, зброю, золата… І, пяткі змазаўшы, ўцякалі.
У Маскве ж наогул не маглі даўмецца, «как так можно!»
Братам па веры драць чубы, біць у каршэнь бязбожна.
Бо з каралевічам, — як ні круці, «католікам праклятым»,
Пётр Канашэвіч два разы хадзіў да маскаля у сваты.
Пад Ельцам аднаверцаў высек, як крапіву пугай,
Пасля разбіў ушчэнт стральцоў пад Ліўнам і Калугай.
Не меў казацкі гетман дробнай хібы ці заганы,
Не быў ён злы, гняўлівы, сквапны, п'яны.
Хоць слабасць меў адну — з жанчынамі грашыў бясконца.
Ды што тут зробіш? Ксяндзы казалі, плямы мае нават сонца…

Хадкевіч ведаў: Канашэвіч прыйдзе, не падмане —
Ў адны шыхты з Літвою і Каронай стане…
Тым часам неба над Днястром ўсё больш чарнела.
Спярша сапегава харугва на загон татарскі наляцела.
Жывых не засталося. Пасля забіты быў Машчынскі,
З ім разам палягла уланаў сотня. Францішак Апалінскі
Паранены татарскаю стралою. На шчасце, небаглосы
Гетмана на небе Бог пачуў. Ў абоз, абдзёрты, босы,
Прыйшоў казацкі сотнік Дарашэнка. «На Макавея, —
Сказаў, — у Крыме пачалася зноў крывавая завея —
Запарожцы ўзялі два замкі і ідуць на дапамогу.
Служыць клянуцца Рэчы Паспалітай, каралю і Богу».
Другая навіна — нарэшце Уладзіслаў уцёк з Варшавы.
Спыніўся блізка Львова і… на качак паляваў дзеля забавы.
З ім разам на чале з Дэнгофам прыйшла пяхота,
З'явіліся мазуры, стралкоў нямецкіх роты.
З харугвамі прыйшлі: князь Януш Вішнявецкі,
Кахаюўскі, Казаноўскі, Казімір Тарлецкі,
Барташэўскі, Андрэй з Дамбровіц, Канецпольскі,
Дзялыньскі, Жыгімонт Тарло, Тамаш Сабескі…
Князь Радзівіл прывёў харугву лёгкую татараў,
Тры моцныя харугвы пехацінцаў і аддзел гусараў.

Ды на вайну не надта каб спяшаўся каралевіч,
Хоць праз паслоў яго прасіў, маліў Хадкевіч
Ісці пад Хоцім. На ўсё адказ адзіны: «Не гатовы
Жаўнеры да вайны. Стамілася пяхота. Няма паловы
Венграў — захварэлі. Астатнія — не рыцары, а здані.
Не тое што змагацца — сваёй хадой ісці не ў стане…
Яшчэ «сюрпрыз» — ардынцы шлях казакам заступілі.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

Хадзілі чуткі — нібыта Сагайдачнага ў палон схапілі.
Хадкевіч выправіў харугву лёгкую Ляшка[1] ў разведку.
Праз тыдзень той вярнуўся і прывёз з сабою сведку.
Згаданы Дарашэнка распавёў: «Арду казакі абмінулі.
Ішлі, нібы ваўкі, тры ночы Дзікім стэпам. Павярнулі
У бок турэцкі. З'язджаліся. Каго знайшлі — забілі...
Ўзялі палонных і абоз. Нічога самі не згубілі».
Ляшко дадаў: «Ўзялі казакі скарб вайсковы.
Султан бы звар'яцеў, ад злосці страціў мову.
Ўсё войска кінуў наўздагон. Казакі адступалі.
Каб выйграць час, сорак лепшых скіравалі[2]
Спыніць Асмана. Усе загінулі, ды памяць не загіне
Ніколі аб героях тых... Героям слава! Слава Украіне!»

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

---

[1] Цытуем Я. Сабескага: «Занепакоены Хадкевіч разважаў над тым, як злому супрацьстаяць. Лішка (Liszka) і Кулічкоўскага, камандзіраў лёгкай кавалерыі, накіраваў у бок Сцепанаўцаў...»
[2] Цытуем Я. Сабескага: «Восем дзён турэцкія войскі наступалі на пяткі казакам... Асман пастанавіў пачаць вайну шчасліва, выцяўшы ўсіх запарожцаў. Сорак казакаў ад войска адсталі і схаваліся ў пячорах, звярнуўшы на сябе ўвагу ворага. З боку туркаў усё рабілася, каб знішчыць тых вояў, пазбаўленых дапамогі. Калі ж і праз дзень, і праз два Асман бачыў дарэмнасць уласных намаганняў – сама прырода добра бараніла казакаў, – пастанавіў перамагчы іх голадам. Змораныя запарожцы адважыліся пайсці на ворага і з боем выйшлі з атачэння. Аднак, знясіленых, іх хутка дагналі турэцкія кулі і шаблі. Са зброяй у руках яны загінулі».